Весткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня "ПАГОНЯ"

Viestki j Paviedamlenni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *VIESTKI, P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 4 (578)
Красавік 2014 г.

Беларуска-Амэрыканскае Згуртаваньне "ПАГОНЯ" правядзе мітынг, прысьвечаны

28-й гадавіне аварыі на Чарнобыльскай АЭС.


Акцыя адбудзецца 26-га красавіка 2014 году каля будынка Арганізацыі Аб'еднаных Нацыяў на Мангэтане ў сквэрыку на скрыжаваньні 1-й Авэню і 43-й вуліцы.

Пачатак акцыі а **1-й гадзіне папаўдні.**

Далучайцеся да мітынгу з сябрамі і знаёмымі, каб яшчэ раз нагадаць сьвету аб катастрофе беларускага народу і аб небясьпецы выкарыстаньня ядзернай энэргіі.

"Маё мястэчка" Васіля Стомы

Стома, Ваісль. Маё мястэчка. Мінск: Лімарыус, 2014. — 292 с. (Беларуская мемуарная бібліятэка)



У менскім выдавецтве "Лімарыус" у сэрыі "Беларуская мэмуарная бібліятэка" пабачыла сьвет чарговая "эміграцыйная" кніга. Гэтым разам гэта "Маё мястэчка" Васіля Стомы (1911—1992). Аўтар нарадзіўся ў Лужках былога Дзісенскага павету (сёньня Шаркаўшчынскі раён Віцебскай вобласьці) У часе Другой сусьветнай працаваў у беларускай адміністрацыі, а пасьля разам з маці й сястрою праз Нямеччыну апынуўся ў ЗША. Звычайны лёс эмігранта, якіх дзясяткі і нават сотні тысячаў аселі ў другой палове XX ст. на Захадзе. Васіль Стома быў адным з заснавальнікаў аддзелу Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня ў Нью-Джэрзі, сябрам Рады БНР, парафіянінам царквы Жыровіцкае Божае Маці, выкладчыкам у беларускай суботняй школцы.

У вольны ад працы ў шавецкай майстэрні час Васіль Стома згадваў пра абрады й звычаі Дзісеншчыны, складаў слоўнічак тамтэйшага дыялекту, а таксама пісаў успаміны. Асноўны зьмест апошніх складае аповед пра дзяцінства й юнацтва, што прайшлі ў Лужках, а дакладней, пра само мястэчка, вуліцы, будынкі, насельніцтва. Калярытныя характары звычайных жыхароў, з гумарам пададзеныя падзеі штодзённага жыцьця – усё гэта стварае выдатны вобраз заходнебеларускага мястэчка ў міжваенны час. Надзвычайнай каштоўнасьцю ўспамінаў ёсьць і іх сакавітая мова.

Прадстаўленыя Стомам Лужкі – мястэчка, дзе нарадзіўся стваральнік іўрыту Эліэзэр Бэн Егуда. Сярод згаданых ва ўспамінах ёсьць а. Язэп Гэрмановіч, вядомы доктар Усевалад Шыран, сьвятар Іван Кушнер, жонка Станіслава Булак-Балаховіча.

Упершыню "Маё мястэчка" Васіля Стомы публікавалася на старонках эміграцыйнага часапіса "Беларускі сьвет", што выдаваўся ў Дэтройце ў 1980-х гг. Пры канцы 1990-х крыху адрозны варыянт успамінаў быў надрукаваны з аўтарскага машынапісу ў менскім "Полымі". Сёньнешняе ж кніжнае "Маё мястэчка" стала найбольш поўным, дзе спалучыліся дэтройцкая рэдакцыя й пазьнейшая менская. Дадаўся таксама тэкст Васіля Стомы пра абрады й звычаі Дзісеншчыны.

Выдадзеныя ўспаміны маюць як аўтарскія, гэтак і рэдакцыйныя камэнтары. Акрамя таго ў кнізе зьмешчаныя невялікія згадкі пра аўтара, запісаныя ў часе інтэрвію зь беларускімі родзічамі Васіля Стомы. Дадаткам выступаюць здымкі зь сямейнага архіву, а таксама выявы сучаснага выгляду Лужкаў, тых будынкаў, пра якія ідзе аповед.

На пачатку сваіх успамінаў аўтар напісаў: "Ведама, што для мяне маё мястэчка было і будзе заўсёды найпрыгажэйшым, найчысьцейшым і найвесялейшым мястэчкам пад сонцам, бо яно перадусім маё. Усе гэтыя *най* хіба застануцца ў маім уяўленьні назаўсёды. А ў сапраўднасьці?.. Ня ведаю. Няхай ацэньвае тэй, хто ня памятае месца, дзе нарадзіўся, узрос і дзе прайшлі гадзіны ягоных першых дзіцячых радасьцяў і гора, дзе ўрэшце ён правёў юнацкія гады і гады сьведамага жыцьця дарослага чалавека. Няхай ацэньвае тэй, хто ня ведаў так, як я, амаль усіх жыхароў майго мястэчка – добрых і благіх, у меру разумных сваім сялянскім розумам і ў меру дурных, багацейшых і бяднейшых, паважных і сьмешных або камічных". Ідучы сьледам за Васілём Стомам чытач зможа ня толькі ўбачыць тыя заходнебеларускія Лужкі, але й, магчыма, узнавіць у памяці ўспаміны ўласнага маленства ды юнацтва.

Натальля ГАРДЗІЕНКА

Сакавіцкі сход Згуртаваньня “Пагоня”

У суботу 8 сакавіка 2014 году ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў чарговы сакавіцкі сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”. Напачатку сходу старшыня Згуртаваньня Віталь Зайка зрабіў аб’яву пра маючае адбыцца 30 сакавіка сьвяткаваньне Дня Волі – 96-х угодкаў абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Затым ён прадставіў госьцю сходу сп-ню Марыян Сагона, адвакатку, што займаецца юрыдычнай практыкай у Нью-Ёрку. Яна адмыслова пагадзілася ўзяць удзел у сходзе арганізацыі і выступіць з прэзэнтацыяй адносна зьмены статусу ў ЗША і пытаньняў, зьвязаных з іміграцыяй і палітычным прытулкам (азылём).

Напачатку сваёй гутаркі сп-ня Сагона распавяла пра абставіны, пры якіх яна пазнаёмілася з прадстаўнікамі Згуртаваньня “Пагоня”. Гэта было год таму каля штабкватэры Аб’еднаных Нацыяў падчас мітынгу “Пагоні” ў сувязі з Днём Волі, супраць рэпрэсіяў і ў падтрымку апазыцыйных сілаў у Беларусі. “Тады я праходзіла ля пляцыка насупраць ААН, недалёка ад месца, дзе я жыву, і ўбачыла сьцягі і шмат прыгожых маладых людзей. Здавалася, што гэта нейкая акцыя мадэляк ці прадстаўнікоў *fashion industry*. Адно толькі зьдзіўляла – колькасьць сьцягоў, якія, я ведала, зь Беларусі, бо шэраг маіх знаёмых ужо даўно займаліся дапамогаю дзецям з Чарнобыльскай зоны, і таму беларускія нацыянальныя сьцягі былі знаёмыя. Калі я падыйшла і загаварыла з прадстаўнікамі арганізацыі – Віктарам Едзіновічам і Віталём Зайкам – дык усё стала зразумела. І тады я прапанавала сваю дапамогу, дала візытоўку”.



Адвакатка Марыян Сагона

Сп-ня М. Сагона адзначыла, што яна па асноўнай спэцыялізацыі зьяўляецца юрыстам у галіне міжнародных бізнэсовых сувязяў, але таксама цікавіцца іміграцыйным заканадаўствам і можа даць парады адносна пачатковых рэчаў у сфэры іміграцыі ў ЗША, зьмены візы і статусу і пытаньнях палітычнага прытулку.

Пачынаючы з пытаньняў іміграцыі, сп-ня Сагона адзначыла, што яна таксама, як пераважная большасьць амэрыканцаў, зьяўляецца нашчадкам імігрантаў. Яе продкі паходзяць з Італіі з вострава Сіцылія, і цяпер Італія стала больш шанаваць сваіх заакіянскіх суродзічаў. Яна нават прапануе грамадзянства нашчадкам выхадцаў з Італіі, і сп-ня Сагона скарыстала з гэтага, маючы цяпер падвоенае, амэрыканскае ды італійскае грамадзянства.

Затым прамоўца спынілася на юрыдычных пытаньнях, зьвязаных са зьменаю статусу ў ЗША, з варыянтамі набыцьця легальнага статусу ў Амэрыцы праз працоўныя візы, палітычны прытулак і шлюб. Сп-ня Сагона дэталёва распавяла пра асноўныя правілы для паданьня на палітычны прытулак, пра неабходныя дакумэнты і пра асаблівасьці гэтай юрыдычнай нормы. Затым яна спынілася на пытаньнях, зьвязаных са шлюбамі з рэзыдэнтамі і з грамадзянамі ў ЗША, жартам зазначыўшы, што апошнім часам “верагоднасьць знайсьці партнэра для шлюбу падвысілася ўдвая”, дзякуючы новаму заканадаўству пра шлюбы і зьмене самой дэфініцыі таго, што зьяўляецца шлюбам.

Сп-ня М. Сагона падкрэсьліла, што для лепшай дапамогі сваім сябрам кіраўніцтву беларускай грамады мае сэнс навязваць шчыльнейшыя кантакты з амэрыканскімі кангрэсмэнамі й сэнатарамі, як прыкладам, з сэнатарам Дыкам Дурбінам або Чакам Шумэрам, мець сувязь з офісамі і даваць інфармацыю пра падзеі ў Беларусі. Сп-ня М. Сагона са свайго боку адзначыла, што паспрабуе праз свае кантакты падрыхтаваць праекты *pro bono*, па якіх прадстаўнікі беларускай грамады, асабліва нядаўнія імігранты, маглі б атрымліваць бясплатную юрыдычную дапамогу або па невялікім або сымбалічным кошце. Гэта практыкуецца ў шмат якіх юрыдычных фірмах, калі пэўная колькасьць гадзінаў адпрацоўваецца юрыстамі бясплатна, як жэст дапамогі й удзячнасьці грамадству.

Затым сп-ня Марыян Сагона адказала на пытаньні прысутных і заклікала асобаў, што хацелі б пагутарыць зь ёю больш канфідэнцыйна, зьвярнуцца да яе пасьля афіцыйнай часткі сходу. Яна таксама паабяцала пазьней электронна даслаць некаторыя матэрыялы, датычныя ейнай гутаркі.

Сп. Зайка шчыра падзякаваў сп-ні Марыян Сагоне ад імя сяброў арганізацыі, выказаў спадзеў на далейшае супрацоўніцтва і запрасіў на сьціплы пачастунак тут жа, разам з іншымі прысутнымі.

Па водгуках удзельнікаў, сустрэча атрымалася цікавай і карыснай.

Віталь ЗАЙКА

Палітыка Лукашэнкі ў Лацінскай Амэрыцы

За апошняе дзесяцігодзьдзе ў беларускай зьнешняй палітыцы адбыўся значны паварот у бок Лацінскай Амэрыкі. Гэта было звязана з аб'ектыўнымі абставінамі: пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у сакавіку 2006 году значна пагоршыліся адносіны з Эўрапейскім Саюзам і Злучанымі Штатамі Амэрыкі. Потым новыя выбары ў студзені 2010 году, абвал эканомікі ў 2011 годзе. Гэтыя падзеі паставілі Беларусь у крытычнае фінансава-эконамічнае становішча. Менавіта на гэтыя часы прыпадае "росквіт" стасункаў з лацінаамэрыканскімі краінамі. Некаторыя айчынныя псэўдапалітолягі лічаць, што Лукашэнка "прарубаў акно" ў Лацінскую Амэрыку, якая стане стратэгічным накірункам дыпляматыі.

Галоўнымі партнэрамі Беларусі ў рэгіёне зьяўляюцца краіны так званага блёку АЛБА ("Баліварыянскі альянс народаў нашай Амэрыкі – Гандлёвая дамова народаў"). Гэты аморфны хаўрус быў створаны пад эгідаю Г. Чавеса і Ф. Кастра ў 2004 годзе, і ў яго цяпер уваходзяць 9 дзяржаў: Вэнэсуэла (галоўны фундатар), Куба, Нікарагуа, Эквадор, Дамініка, Сэнт-Вінсэнт і Грэнадзіны, Антыгуа і Барбуда, Сэнт-Люсія. Да гэтай групы гарманічна дапасуецца яшчэ шэраг краінаў-назіральнікаў, сярод якіх: Іран, Сірыя і Гаіці, адна з найбяднейшых краінаў у сьвеце, дзе насельніцтва вымушана жыць менш чым на 2 дал. ў дзень. Мэта гэтага саюзу – стварыць Зону свабоднага гандлю ў паўдневым рэгіёне як альтэрнатыву Паўночнаамэрыканскай зоне свабоднага гандлю пад патранажам ЗША.

Але што на самой справе было зроблена, і якія вынікі меў для Беларусі гэты паварот за пэрыяд з 2006 па 2013 гады? Закранем толькі найбольш раскручаныя афіцыйнаю прапагандаю накірункі супрацоўніцтва. Гэта, канешне ж, нафтаздабыча, будаўніцтва і пастаўкі прадукцыі беларускага машынабудаваньня.

Нельга ня ўспомніць эпапею з вэнэсуэльскаю нафтаю "Санта-Барбара". Плянавалася, што гэта будзе надзвычай прыбытковы праект. Па дадзеных вэнэсуэльскіх СМІ ў 2010 годзе пастаўкі "чорнага золата" абыходзяцца Беларусі на 30% таньней за рынкавы кошт і, нават з улікам транспартыроўкі праз 3 парты: Адэса, Мууга і Клайпэда, а пасьля чыгункаю да Беларусі, гэта будзе таньней за пастаўкі расейскай нафты з улікам падаткаў. Праект пачаў рэалізоўвацца з 2010 году.

Аднак нават дадзеныя Белстату сьведчаць, што сярэднекантрактны кошт расейскай нафты ў студзені-лютым 2012 году склаў 426 даляраў за тону, вэнэсуэльскай (горшай па якасці) – 917. У пачатку 2012 году пастаўкі вэнэсуэльскай нафты скараціліся ў 4,5 разы ад заплянаваных 1,5 млрд. тон і ўжо 7 чэрвеня 2012 году першы віцэ-прэм'ер Беларусі У. Сямашка заявіў: "У сёньняшняй сытуацыі няма эканамічнага сэнсу гэтую нафту імпартаваць".

Гэтая хуткая хранальёгія падзеяў сьведчыць, што і тут не атрымалася дывэрсыфікаваць энэргетычную палітыку Беларусі за кошт вэнэсэульскай нафты, але гэта і кожнаму разумнаму чалавеку было відавочна, толькі ня сёньняшнім кіруючым колам Беларусі.



Адбылося гэта толькі з той нагоды, што вэнэсуэльская нафтаздабыча, таксама як і рынак узбраеньняў, будаўнічая прамысловасьць, значна залежаць ад Расеі, якая зьяўляецца адным з асноўных гульцоў у гэтай краіне, актыўна крэдытуе яе эканоміку. Але дзеля беларускага тэлегледача падаецца, што Лукашэнка нейкі "піянэр" і выдатны дыплямат. А тое што на самой справе Беларусі застаюцца толькі дробязі ад "вэнэсуэльскага пірага" і толькі тое, што не цікавіць нашага ўсходняга суседа, пра гэта не распавядаецца.

Другі накірунак – будаўніцтва жыльля і інфраструктуры. У першую чаргу гэта тычыцца Вэнэсуэлы. Сапраўды, нашыя будаўнікі і спэцыялісты правялі значную працу ў Балівараянскай Рэспубліцы, але ж зь якой нагоды яны паехалі працаваць за акіян у джунглях замест таго, каб дабудаваць тое, што пачалі будуваць на Радзіме? Справа ў тым, што ў 2000-х гадах нашая будаўнічая прамысловасць аднавіла свае вытворчыя лініі і назапасіла на складах шмат канструкцый для будаўніцтва панэльных і маналітна-каркасных дамоў. Плянавалася, што будаўніцтва жыльля павінна будзе стаць "лякаматывам" прамысловасьці, яно падштурхне ўсе астатнія сумежныя галіны: хімічную, лёгкую, дрэваапрацоўчую і г. д. Спачатку так і адбывалася, калі пачаўся бум ільготнага крэдытаваньня ў 2006-2010 гадах. У пачатку 2011 году адбыўся эканамічны каляпс, пачалася няўдалая дабудова таго, што было пачата. Зразумела, насельніцтва ня можа плаціць грошы за жытло, калі кошты за яго ўзрастаюць у 3 разы. Што робіць дзяржава – накіроўвае будаўнікоў у Вэнэсуэлу, хай зарабляюць валюту і разгружаюць склады. З другога боку, у апошні час амаль кожны дзень па беларускаму тэлебачаньню можна назіраць, як камісія пры Лукашэнку на чале з кіраўніком ягонай адміністрацыі А. Кабяковым "надрываецца" і пагражае турмою за зрыў уводу аб'ектаў у эксплюатацыю. Канешне, таму што кваліфікаваныя беларускія спэцыялісты будуюць паўсюль – у Расеі, у Вэнэсуэле (таннае жылле жыхарам гангстэрскіх фавэл), у Беларусі (новую рэзыдэнцыю Лукашэнкі на праспэкце Перамогі) – але толькі не для беларускага народу, таму што дзяржаве гэта нявыгадна, бо народ ня можа заплаціць. А дзяржава і ня хоча стварыць умовы, каб яе грамадзяне маглі зарабіць грошы. У выніку, каля двухсот недастроеных дамоў – гэта тое, што застаецца нашым людзям.

Што тычыцца паставак тэхнікі, то акрамя некалькі соцень грузавікоў, самазвалаў, трактароў і аўтобусаў, пастаўленых у шэраг лацінаамэрыканскіх краінаў, і ўдзелу ў гандлёвых выставах, прыпомніць няма чаго.

Падводзячы вынік, можна адзначыць наступнае, тавараабарот Беларусі з Вэнэсуэлай за 2011 год склаў каля 2 млрд. даляраў, з Кубай – не перавышаў 60 млн. даляраў, з Дамініканскай Рэспублікай у 2010 годзе – 201,6 тыс. даляраў.

З гэтае нагоды напрошваюцца наступныя пытаньні – ці ня быў змарнаваны час, і чаму мы гублялі і працягваем губляць добрыя стасункі з нашымі суседзямі краінамі ЭС і ЗША? Хто пэрсанальна адказны за гэта?

Аляксандар СОЛАД

“Галгатня пра ЗыШыА”

У чаканьні новай тэакратыі

Калі пры ўладзе быў п’яны Ельцын, расейцы зразумелі, што трэба выбіраць – або дэмакратыя, або Радзіма. Расея ў гэтым пляне не выключэньне, бо ў XXI-м стагодзьдзі дэмакратычных сыстэмаў у сьвеце фактычна не засталося. Паўсюль пануюць „дэмакратуры” – сыстэмы пераходнага этапу паміж дэмакратыяй і новым векам “багоў”. Гэта амаль трыста гадоў таму прадказаў у кнізе „Асновы новай навукі аб агульнай прыродзе нацый” нэапалітанец Джамбатыста Віка. У ЗША ўсталявалася „дэмакратура” адной групоўкі з двума магчымымі назвамі „дэмапублікан” або „рэпублікрат”. У Эўрасаюзе (які назваць Эўразьвязам больш не паварочваецца язык) запанавала „дэмакратура” на ўзор СССР, са сваёю вярхушкаю, палітбюро, нявыбранымі прэзыдэнтамі і незьлічонымі камісарамі. У Расеі зьявілася свая вэрсія кадэбэшнай „дэмакратуры” з Пуціным у цэнтры.

А можа гэта і добра? Бо дэмакратыя – гэта сыстэма найгоршага ў гісторыі XX стагодзьдзя. Гэта сыстэма, дзе прафэсар і бомж вырашаюць як уладкаваць будучыню, сыстэма, якая зрабіла магчымымі кар’еры такіх дзеячаў як Ленін і Гітлер, сыстэма, якая няўхільна пракладвае дарогу да розных сацыялізмаў, камунізмаў і бальшавізмаў. Навошта калупацца ў гісторыі, калі ў нашай Бацькаўшчыне ўсё яшчэ пануе прывід дэмакратыі XX стагодзьдзя – А. Лукашэнка.

Вось так мы і жылі б у нанова падзеленым на імпэрыі, хаатычным, але, будзем спадзявацца, кароткім веку „дэмакратураў”, калі б не адна, найбольш дзьве, акалічнасьці. Да палітычнай вярхушкі Расеі, здаецца, дайшло, што калі яшчэ адно пакаленьне ў краіне працягне ўжываць вірусную прадукцыю „Made in Hollywood”, то ад яе ўласнай вэрсіі „дэмакратуры” нічога не застанецца. Не выпадкова „Першы канал” расейскага тэлебачаньня адмяніў прамую трансьляцыю цырыміоніі ўручэньня „Оскара”. Трохі пазьней цыромонію, хоць трохі падрэзаўшы, усё ж паказалі. Але выглядае, што Крэмль усё ж пачынае цяміць, што адзіная магчымасьць адгарадзіць моладзь ад самазьнішчальнай маскультуры – гэта вяртаньне да атмасфэры халоднай вайны. Нішто так не ўздымае патрыятызм як вонкавы вораг.

А што на ўсё гэта так званы Захад? Вуснамі Анэлькі Мэркель „эўрадэмакратура” прызналася, што вайны, прынамсі ў Эўропе, ужо ніяк не чакала... „Вачыма” каналу MSNBC „амэрыдэмакратура” ўбачыла мапу, на якой Украіна мяжуе з ужо дваццаць гадоў неіснуючай Чэхаславаччынай. Вушы вянуць, калі прыгадваецца, як падчас апошніх прэзыдэнцкіх дэбатаў (пашукайце на YouTube „Remember Obama mocking Romney with this comment about Russia during a 2012 debate?”), цяперашні гора-прэзыдэнт насьміхаўся са сьцверджаньня, што Расея можа камусьці яшчэ пагражаць. Носам адчуваецца, што перш чым адрэагаваць на крымскія манэўры, Захаду, відаць, спатрэбіцца, як неаднойчы ўжо бывала, яшчэ некалькі гадоў на вывучэньне геаграфіі ды гісторыі.



Так і атрымліваецца, што ў эпоху „дэмакратураў” маладая анахранічная ўкраінская дэмакратыя засела ўсім як стрэмка ў воку. І нахабнай Расеі, і здэградаванай Эўропе, і ЗыШыА з сындромам раздваеньня.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àôåÿðàâàííì³:

Я. Бандарык 60
І. Галавашка 60
С. Гехт 60
А. Нікіперовіч 60
А. Сьвістун 60
А. Чаравач 60
Ю. Малахаў 50

Усім шчыры дзякуй!

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ” адбудзецца **ў суботу 12 красавіка 2014 году** на Мангэтане па адрасу:

Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**.*

Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад Union Square па 15-й вуліцы на скрыжаваньні з Irving Place.

Заля знаходзіцца на другім паверсе будынка.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, лджаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы ў інтэрнэце ўэбстаронку **pahonia.com***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

Ю. Малахаў 30
В. Блоцкі 30
І. Галавашка 30
С. Гехт 30
Н. і С. Дудар 30
А. Копат 30
А. Чаравач 30
І. і А. Чумаковы 30

Шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:

P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя *Viktar Yedzinovich.*

*Падпісацца на бюлетэнь могуць усе зацікаўленыя даслаўшы аплату гадавой падпіскі (**$30**) на адрас:*
VIESTKI
P. O. Box 3225
Farmingdale, NY 11735

*Чэкі з адзнакаю **“Весткі”** выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня” **Viktar Yedzinovich**.*

*Падпіску таксама можна аформіць, наведаўшы ў інтэрнэце старонку **www.e-krama.com***

*Паважаныя **А. Генечка, К. Кажэнаў, Ю. Караваева, В. Міхайлава, М. Самусь, Ю. Цяліца,** калі ласка, паведаміце рэдакцыі поштаю ці емэйлам вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*